# Бібліятэкары па прафесіі і прызванню

**Прафесія бібліятэкар — адна са старажытнейшых у свеце. Яна стаіць у пачатку асветы, навукі і культуры. Статус бібліятэкара ў грамадскай свядомасці то ўзвышаўся, то падаў. Нагадаем, што ў XVIII стагоддзі бібліятэкара цанілі, мяркуючы па аплаце яго працы, вышэй, чым обер-пракурора Сінода, губернатара, обер-сакратара Сената, не кажучы аб "простых" сенатарах.**

У XX стагоддзі ў былым Саюзе хоць і заўважана зніжэнне прэстыжу бібліятэчнай працы, аднак патрэба грамадства ў гэтай прафесіі не знікла. На Беларусі яна паўстала асабліва востра ў пасляваенныя гады. Таму ўжо ў 1944 г. пры педагагічным інстытуце ў Мінску быў адкрыты бібліятэчны факультэт, які па праву стаў заснавальнікам інстытута культуры.

...Успамінаецца маладосць, сябры, выпуск 1961 года. Многа старонак прыемных успамінаў можна прысвяціць нашым выкладчыкам — Мікалаю Цімафеевічу Талкунову, Капіталіне Гардзееўне Маўрычавай, Ніне Мікалаеўне Калоска, Канстанціну Сцяпанавічу Вераб'ю, Марыі Ільінічне Савачкінай, Валянціне Пятроўне Івановай, Валянціне Мікалаеўне Дзмітрыевай, Ларысе Максімаўне Буракінай. З імі звязаны самыя запамінальныя з'явы студэнцкага жыцця. Гэта яны прывівалі нам любоў да прафесіі, гэта яны адкрывалі нам цудоўны свет ведаў, уменняў, навыкаў. Мо й таму выпуск наш меў такі плённы вынік.

Дзе толькі не працуюць ці не працавалі да заслужанага адпачынку мае аднакурснікі! Раіса Аўрамаўна Ровіна, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, працавала шмат гадоў дэканам бібліятэчнага факультэта, а цяпер — загадчыца вучэбнай часткі БУК. Ніна Андрэеўна Ляйко, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, працяглы час працавала загадчыцай кафедры фондаў і каталогаў, у сучасны момант — галоўны спецыяліст у галіне каталагізацыі дакументаў. Людміла Фёдараўна Платоненка — чвэрць стагоддзя цудоўны нязменны завуч Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума; усё працоўнае жыццё выкладчыкамі гэтага тэхнікума былі Раіса Аляк-



Будні факультэта



сееўна Чэчуева і Святлана Рыгораўна Русецкая.

Доўгі час узначальваў Урадавую бібліятэку Павел Архіпец, там жа праявілі свае высокія прафесійныя здольнасці і талент Іна Курляндчык, Ніна Закаблук, Людміла Яглоўская.

А колькі спецыялістаў нашага выпуску папоўнілі штат бібліятэкараў Нацыянальнай бібліятэкі! Добрым словам успамінаюць маладыя супрацоўнікі Валянціну Жак, загадчыцу аддзела мастацтва, Ларысу Прадко, загадчыцу аддзела абслугоўвання, Іну Занкевіч, загадчыцу аддзела МБА, Марыю Сокал, галоўнага бібліятэкара аддзела бібліятэказнаўства, Зою Даўгяла і Святлану Якавенка, супрацоўнікаў аддзела тэхнічнай літаратуры, Галіну Казлову. Мудрым дырэктарам Гродзенскай абласной бібліятэкі запомнілася Алена Ушава. Шмат гадоў аддала культуры ў якасці загадчыцы аддзела ў адным з раёнаў Гродзеншчыны Марыя Дуровіч. Шчыруюць плённа на бібліятэчнай ніве ў розных установах Шура Дарашэвіч, Рыта Вахрамеева, Тамара Макарэвіч, Галя Левашова, Нэла Адамовіч, Люда Яршова. Яны выхавалі не адно пакаленне таленавітых і адданых справе бібліятэкараў.

...Шмат гадоў працякло і, прабачце, сябры, калі не ўсіх успомніла, а мо і прозвішчы часам падала дзявочыя. Сутнасць жа маіх нататкаў у адным: наш выпуск — гэта выпуск бібліятэкараў і па прафесіі, і па прызванню. Гэта ўклад "шасцідзесятнікаў" у развіццё цэлага этапу бібліятэчнай справы на Беларусі.

Хочацца выказаць сардэчную падзяку нашаму бібліятэчнаму факультэту, а яго пераемніку — факультэту бібліятэчна-інфармацыйных сістэм — зялёнага святла для працягу лепшых традыцый і поспехаў у падрыхтоўцы бібліятэкараў новага тысячагоддзя.

*Л.А.Дзямешка (Ляневіч)*